


КЛІМАВІЦКАЯ ІНФА-ПАНАРАМА

№1(99)

10 студзеня 2013 Клімавіцкі грамадска-палітычны бюлетэнь

С НОВЫМ 2013 ГОДОМ!!!

Счастья, веселья, всех радостей в свете
Взрослым желаем, а также их детям!
Горы подарков и слов самых светлых,
Осуществленье мечтаний заветных!
Празднуют люди, ликует природа —
С Новым 2013 Годом!



СЕМЬЯ КРЕПКА ЛАДОМ

Данила МЕСТИЧ

Чтобы понять важность и истинный смысл семейных отношений, вовсе не нужно обращаться к модным психологам или искать подсказки в специальной литературе. Достаточно перечитать народные пословицы и поговорки, которые кратко и одновременно ёмко объясняют, что «Семья крепка ладом». А для сомневающихся растолковывается: «Муж не сапог: не снимешь с ног», «Жена не шуба: не сменишь, коль не люба».




Но сегодня в ходу совсем другие истины, в которых нет места традиционным семейным ценностям. Некогда крепкая белорусская семья разваливается на глазах, представляя собой нечто невообразимое. Количество разводов перевалило уже за 50% от числа браков, то есть распадается каждый второй брак.

Особенно это касается Климовичского района, где расторжение браков стало чуть ли не повсеместным. Но это не помешало районному идеологу Марии Пракопчик объявить о завершении проекта «Счастье быть вместе», направленного на популяризацию семьи и семейно-брачных отношений. Об «успешности» проекта можно судить по последним сведениям отдела статистики Климовичского района. За январь-сентябрь 2012 г. по сравнению с аналогичным периодом 2011 года количество зарегистрированных браков увеличилось на 1,2%, количество разводов — на 40,6%. На 1000 регистрируемых браков приходится 520 разводов, а год назад (в январе-сентябре 2011 г.) — 374.

Несомненно, главной причиной этого является глубочайший упадок общественной морали, деформация взглядов на супружеские обязанности, отказ от традиционных представлений о значении семьи в жизни общества и личности. Здесь уместно сослаться на мнение председателя суда Климовичского района Олега Голочевского. Известному интернет-порталу TUT.BY он сказал, что основным виновником неудавшихся браков в Климовичском районе (50-60% случаев) можно назвать случайные взаимоотношения. То есть браки были вынужденными: «Когда пара мне заявляет, что у них разные характеры, сразу лезу в документы и смотрю, что же так на нравы повлияло, почему не сошлись-то? И оказывается, почти всегда от даты свидетельства о заключении брака до даты свидетельства о рождении первенца девяти месяцев явно нет».

К сказанному добавим, что вновь убеждаешься в правоте народной мудрости: «Свадьба скорая, что вода полая».

КСТАТИ:
Характерно, что по опросам, которые провела социальная сеть vk.com/iloveklimovichi, почти каждый третий участник виртуального голосования не против погулять на стороне. Участникам интернет-сообщества был задан вопрос «А как Вы относитесь к романам с женатыми (замужними)?». Из 1320 человек, участвовавших в опросе, 327 или 24,8% дали следующий ответ «Почему бы и нет?».



САБАКА-ПАШТАЛЬЁН

Алёна ПАЛЯКОВА

Заўважыла, што адначасова ў розных газетах з'явіўся невялічкі аповед пра паштальёнку з Клімаўшчыны і яе чатырохногага "памочніка". На першы погляд, надрукавана цікавая замалёўка з жыццёвай рэчаіснасці. А калі задумацца, то цікавага ў гэтай гісторыі няшмат.



Дык чаму паштальёнка Лідзія Жыгаліна прыцягнула да сябе ўвагу абласных і рэспубліканскіх газет? Ужо некалькі гадоў яна працуе на першым участку паштовага аддзялення Хатовіж Клімавіцкага раёна. Згодна з прафесійнымі абавязкамі разносіць газеты, часопісы і лісты па трох суседніх вёсках — Хадунь, Ганнаўка і Хатовіж. Звычайная, але разам з тым вельмі патрэбная грамадству праца. Але дзяржаўныя журналісты ўпадабалі ў яе прафесіі іншае. Справа ў тым, што Лідзіі Жыгалінай дапамагае сабака па мянушцы Умка. Іх і сфатаграфавалі разам, на здымку паштальёнка і сабака, які трымае ў зубах газеты.

З нейкім дзіўным замілаваннем чытачам паведамляецца, як штодзень у любое надвор'е яны крочаць па сваім звыклым маршруце. Сабака ўжо ведае, якую газету ў які двор трэба аднесці. Так і хочацца сказаць, сапраўдны памочнік Умка! Але наколькі добра, што падпісчыкі атрымліваюць газеты з сабачых зубоў? Пагадзіцеся, неяк гэта негігіенічна. Па-другое, разносіць пошту ў сельскай мясцовасці не самая ўдзячная праца. Як паведамляюць самі журналісты, гэта робіцца штодзень і ў любое надвор'е. А ў нашым выпадку паштальёнка Жыгаліна вымушана праходзіць каля дзясятка кіламетраў ад адной да другой вёсцы. Ды яшчэ дапамагае асобным старым вяскоўцам, прыносіць ім хлеб і лекі.

Пасля асэнсавання ўсіх нешматлікіх фактаў, разумееш, што сапраўды цікавага і тым больш забаўляльнага ў апісанай сітуацыі няма. Пагадзіцца хадзіць дзясяткі кіламетраў у дождж і снег можна толькі не ад лепшага жыцця. Гэта пацвярджае і наступны прыклад. Якраз у снежні бялыніцкая раённая газета "Зара над Друццю" змясціла размову з паштальёнам вёскі Вугольшчына Аленай Мысавай. Жанчына распавяла пра тое, які заробак яна атрымлівае: "Мне, натуральна, вельмі хацелася б выпісваць шмат газет і часопісаў. Але зрабіць гэтага не магу з-за матэрыяльных цяжкасцей — не паверыце, але мая месячная зарплата не дасягае і 300 тысяч беларускіх рублёў".

У звязку з гэтым незалежны бялыніцкі журналіст Барыс Вырвіч расказаў, што пра заробак у памеры мільён рублёў многія вясковыя паштальёны сёння могуць толькі марыць: "Я добра ведаю гэту сістэму, бо ў свой час давялось папрацаваць і паштальёнам, — кажа спадар Вырвіч. — Падтрымліваю кантакты з былымі калегамі па працы і магу запэўніць, што пра заробак у памеры 1 мільён рублёў многія з іх могуць толькі марыць. Людзі атрымліваюць за сваю нялёгкую працу літаральна капейкі. Адміністрацыя вузлоў паштовай сувязі даўно прыдумала, як не плаціць нават мінімальнага заробку. Яны пастаянна зніжаюць працягласць працоўнага часу для сваіх супрацоўнікаў, за які аплочваюць грошы, пры тым, што аб'ём працы не памяншаецца, а, наадварот, часцяком і павялічваецца. Вось і атрымліваецца, што паштальёны афармляюцца на 0,3-0,5 тарыфнай стаўкі і атрымліваюць некалькі соцен тысяч рублёў, на якія яны павінны яшчэ і выпісаць дзяржаўныя газеты. Людзі пастаянна скардзяцца, але на іх звароты ніхто не рэагуе. Сапраўдныя заробкі ў многіх сельгаспрадпрыемствах Бялыніцкага раёна не нашмат адрозніваюцца ад заробкаў паштальёнаў, іншай жа працы няма, вось і вымушаны гэтыя жанчыны працаваць за капейкі. Як яны выжываюць на гэтыя грошы ў нашай "квітнеючай" Беларусі з шалёнымі коштамі літаральна на ўсё, мне цяжка нават уявіць".

АДКРЫЛАСЯ "ГАРАЧАЯ ЛІНІЯ" ФЕДЭРАЦЫІ ПРАФСАЮЗАЎ БЕЛАРУСІ

На вашым прадпрыемстве не выконваецца заканадаўства аб ахове працы? Не створаны належныя бытавыя ўмовы, парушаецца тэмпературны рэжым, неналежным чынам арганізавана гарачае харчаванне?

У сувязі з гэтым рэспубліканская газета "Звязда" паведамляе наступнае. Вы можаце патэлефанаваць і пакінуць інфармацыю аб наяўных парушэннях па тэлефоне ў Мінску 203 96 41. Тэхнічныя інспектары працы Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі гатовы выехаць на месца і праверыць ваш сігнал. Федэрацыя прафсаюзаў Беларусі мяркуе, што работа "гарачай лініі" дасць магчымасць аператыўна выяўляць недахопы і парушэнні выканання правілаў і нормаў аховы працы і своечасова прымаць меры па іх ліквідацыі.

УКРАІНА Ў 2013 ГОДЗЕ ПРЫПЫНЯЕ ПРЫЗЫЎ У ВОЙСКА

У 2013 годзе на Украіне будзе прыпынены прызыў на тэрміновую ваенную службу з адначасовым пераходам на камплектаванне арміі выключна па кантракце, заявіў міністр абароны краіны Павел Лебедзеў.

Як паведамілі ў прэс-службе мінабароны, аб гэтым міністр заявіў у вітальнай прамове з нагоды навагодніх і калядных святаў.

«Ужо ў новым годзе нас чакаюць новыя, маштабныя задачы. Будзе перагледжана структура і сістэма кіравання ўзброенымі сіламі і палепшаная сістэма падрыхтоўкі спецыялістаў, прыпынены прызыў на тэрміновую ваенную службу з адначасовым пераходам на камплектаванне арміі выключна па кантракце, як гэта зроблена сёння ў вядучых краінах свету», — сказаў Павел Лебедзеў.



АЛЕКСАНДР МИЛИНКЕВИЧ: У ЛУКАШЕНКО СЕГОДНЯ ТРИ СЦЕНАРИЯ

Демократические перемены в Беларуси — не из разряда новогодних чудес, уверен лидер движения "За свободу" Александр Милинкевич. О надеждах, ожиданиях и планах на 2013 год политик рассказал в интервью DW – «Немецкая волна».

DW: Каков план действий движения "За свободу" на 2013 год?

Александр Милинкевич: Все планы связаны с нашей стратегической целью — евроинтеграцией. Только такой выбор гарантирует Беларуси демократию, свободные выборы, защиту прав человека и главное — сохранение суверенитета. Наша задача — показать людям, какие перемены выгодны им и стране, сделать их соавторами реформ. Для этого мы продолжим два проекта — "Народная программа" и "Европейские клубы".

Цель Европейских клубов, а они легальны и есть во всех областных городах, — приумножить число проевропейски настроенных белорусов. Акцент здесь делается на информирование населения о демократических реформах в странах бывшего соцлагеря.

DW: Но нынешняя власть в преддверии Нового года активно заговорила о модернизации. Ждать ли перемен сверху?

Александр Милинкевич: Власти трактуют модернизацию превратно. Во-первых, они хотят ограничить её лишь техническим переоснащением предприятий. Во-вторых, средства на неё предполагается брать из госбюджета. В-третьих, в качестве партнеров ставка делается на страны третьего мира, а также Россию и Китай. Евросоюз помог бы гораздо эффективнее. Проведение модернизации предполагает полемику и дискуссии, что невозможно в условиях стагнирующей белорусской власти, где всё подчиняется президенту, который и есть главный противник перемен.



У Лукашенко сегодня три сценария. Первый — эволюционный — отказ от абсолютной власти, но с сохранением определенной её преемственности и плавной модернизацией экономики. Второй — бездействие, самоизоляция, что приведёт к экономическим и социальным потрясениям. Третий — сдавать Беларусь России.

Опыт реформ в ряде стран ЕС показал, что возможен вариант — демонтажа авторитарной системы и реформ в политике и экономике под контролем власти, но при допуске демоппозиции в парламент и правительство. Опыт Польши — пример того, что переговоры идейных противников возможны. Надеюсь, что им у нас воспользуются. Пока, к сожалению, белорусская власть представляется нереформируемой.

ЗАПАСЫ РАСТУТ, СКЛАДЫ ЗАПОЛНЯЮТСЯ



Александр ВЛАД

В конце декабря Правительство Беларуси взялось за привычную работу — раздавать обещания на предстоящий год. Признаться, и в этот раз белорусские граждане услышали много интересного.

Например, 19 декабря в правительственной газете «Рэспубліка» появляется обширное интервью с министром экономики Николаем Снопковым. Название материала убивает наповал: «Достойно жить не запретишь». А среди высказываний министра особенно выделяется одно. На вопрос: «А зарплата в 700 долларов будет в следующем году?», он безапелляционно отвечает: «Думаю, без проблем. То, что смогут заплатить предприятия, то и заплатят».

В результате возникают сплошные непонятки. Всё-таки «без проблем» или всё же «то, что смогут заплатить»? Как говорится, это две большие разницы. К тому же нынешнее положение большинства предприятий не оставляет надежд даже на пресловутые 500 долларов. Но, похоже, в Правительстве работают сплошные оптимисты. Об этом же свидетельствует недавнее совместное постановление Совета Министров и Национального банка от 13 декабря. Постановление направлено на создание условий по повышению объёма выручки в конкретных регионах страны. В каждой области выделена группа отстающих районов, которым предписано увеличить объёмы выручки от реализации продукции на одного занятого.

В частности, в Могилёвской области в такую группу попали Климовичский, Хотимский, Чериковский и ряд других районов. Всем им намечено получить в 2013 году не менее 165 миллионов рублей выручки на одного занятого. Говоря иначе, почти по 14 миллионов в месяц на каждого занятого в экономике района. А теперь вспомните, сколько в Климовичах, Хотимске или Черикове предприятий и организаций с таким уровнем производства?

Конечно, в постановлении указывается, что в районах предполагается открыть новые промышленные организации. Даже если и так, их ещё необходимо создать, а планы по выручке на 2013 год уже существуют. Немаловажен и такой момент. Подчёркивается, что запланированные миллионы должны быть получены от реализации продукции. А вот с этим уже сейчас возникают серьёзные проблемы. В настоящее время на складах промышленных предприятий страны скопилось готовой продукции на 23 трлн. 221 млрд. рублей. На 1 декабря объём нереализованной продукции составил 59,7% среднемесячного объёма производства, увеличившись за ноябрь на 2,8%. Как видим, запасы на складах растут, откуда же брать выручку от реализации продукции?

В Климовичском районе склады предприятий также переполнены нереализованными товарами. За январь-октябрь 2012 года запасы готовой продукции на складах промышленных предприятий района составили 65% к среднемесячному объёму производства. А за ноябрь они опять подросли и теперь составляют 68%. Это существенно выше, чем в среднем по стране. Несмотря на это, Правительство и Нацбанк принимают оптимистические постановления, а министр экономики обещает «без проблем» 700 долларов.



“КІНАVARKA” АДЗНАЧЫЛА КЛІМАЎЧАНІНА

Міхась ПЯТРОЎ

Адбыўся форум альтэрнатыўнага малабюджэтнага кіно Беларусі «КінаVarka». Фільм Алеся Лапо «Вандроўнік не вернецца» працягвае збіраць узнагароды

Пра маладога кінатворцу з Клімавіч Алеся Лапо наша газета пісала ўжо неаднойчы. І кожны раз інфармацыйная нагода зноў дазваляла нам ганарыцца нашым земляком. Вось і зусім нядаўна праходзіў 4-ты Форум альтэрнатыўнага малабюджэтнага кіно Беларусі «КінаVarka». На ім было прадстаўлена 36 фільмаў. Нягледзячы на тое, што журы не прысудзіла ніводнаму з фільмаў Гран-пры, пераможцы на форуме былі вызначыны.

Вось што кажуць пра падзею СМІ: «Па большасці галасоў журы фестывалю ў нас не было лідара, — паведаміў рэжысёр, прадзюсар тэлекампаніі “Карамболь Уладзімір Максімкаў, перадае БелаПАН. — Але для таго, каб вы не думалі, што мы хочам пакінуць нашы прызы сабе, рондаль грошай і камеру для здымак у экстрэмальных умовах мы аддамо фільму, які часцей за ўсіх трапляў у намінацыі журы. Такое рашэнне нам падказаў старшыня журы рэжысёр Аляксандр Яфрэмаў». У выніку быў адзначаны кароткаметражны фільм «Вандроўнік не вернецца». Алесь Лапо атрымаў прэмію і камеру для здымак.

Гэтая ж стужка перамагла на форуме «КінаVarka» яшчэ ў адной намінацыі — «Лепшы дакументальны фільм». Сам стваральнік так апісвае яе сюжэт: «395 дзён, 25 тысяч кіламетраў, 13 краін Паўночнай і Паўднёвай Амерыкі… Пасля доўгай вандроўкі Кірыл Краўцоў вярнуўся ў Беларусь, каб даць новае жыццё вымерлай вёсцы, перайсці на беларускую мову і проста прымаць гасцей…».

На цырымоніі ўзнагароджання Алесь Лапо агучыў свае погляды на сучаснае кіно, а таксама на ўласную творчасць: «Ужо дастаткова працяглы час кіно для мяне асаблівае захапленне. Адзінае, што бянтэжыла і не давала спакою, што ў Беларусі яно не такое развітае і цікавае, як хацелася б. Каб неяк тое выправіць і зрабіць свой аматарскі выклік выпускнікам розных беларускіх і не толькі кінаакадэмій, зняў свой невялічкі фільм. І хоць ён не сказаць, каб вельмі атрымаўся (усё-ткі, першая спроба), аднак мае пэўны поспех... Пасля здымак нават здзівіўся, як гэта проста здымаць кіно: галоўнае, жаданне штосьці сказаць гледачу і любіць гэтую справу — кіно. І здаецца, што для гэтага можна абысціся і без кінаакадэмій».



ТРИ ВУЗА ЛУКАШЕНКО

На встрече со студентами БГУИР Александр Лукашенко признался, что закончил три университета. Однако в биографии на сайте главы государства названы только два вуза. Где официальный лидер получил третье высшее образование?

В пятницу Лукашенко сказал студентам Белорусского государственного университета информатики и радиоэлектроники, что точные науки — не его конек, и он, наверное, не смог бы учиться в этом вузе. На реплику ректора БГУИР Михаила Батуры о том, что главе государства бы помогли, Лукашенко ответил, что больше учиться уже не хочет: «Я их три закончил, мне уже хватило. Двадцать с лишним лет учился».

Согласно биографии на официальном интернет-портале president.gov.by, Александр Лукашенко окончил два вуза: Могилевский государственный университет им. Кулешова в 1975 году по специальности «историк» и Белорусскую сельскохозяйственную академию в 1985 году по специальности «экономист».

«Салідарнасць» поинтересовалась у руководителя пресс-службы главы государства Павла Легкого, где Александр Лукашенко получил третье высшее образование.

— Деталей не знаю, – сказал глава пресс-службы президента. – Надо уточнить. В советское время была еще высшая партийная школа. У отца на заводе мастер писал: одно высшее образование. А диплом об окончании высшей партийной школы дома лежал.

— Может быть, Александр Лукашенко под третьим образованием имел в виду свой первый президентский срок? – предположила корреспондент «Салідарнасці».

— Не исключено, – ответил Павел Легкий. – Президент и раньше говорил о том, сколько ему пришлось учиться в первые годы.

Руководитель пресс-службы предложил перезвонить ему позднее, а он, в свою очередь, попробует уточнить, какой третий университет окончил Лукашенко.

ЕВРОСОЮЗ ВВЕЛ НОВЫЕ ПРАВИЛА ПРОВОЗА ВАЛЮТЫ ЧЕРЕЗ СВОИ ГРАНИЦЫ

Как сообщает Еврорадио, на всей территории ЕС с 1 января начала действовать единая форма таможенной декларации для заявления физических лиц о перемещении денежных средств.



Новые меры объясняют борьбой с преступностью и терроризмом. Теперь при прибытии и отбытии с территории ЕС гражданин, имеющий при себе сумму от 10000 евро, обязан подать таможенную декларацию дважды — как при ввозе, так и при вывозе денежных средств.

Декларировать нужно не только наличные деньги в евро, но и эквивалент в любой другой валюте, а также ценные бумаги. Правило действует и при проезде через страны ЕС транзитом.

Если в декларации будут поданы недостоверные или неполные сведения, заявителя ждет наказание, а деньги могут конфисковать.

И ОТХОДЫ ДОРОЖАЮТ

Александр ВЛАД

В Беларуси ежемесячно растут цены. Официально инфляция не такая значительная, как год назад, когда цены буквально зашкаливали. Сейчас – с января по ноябрь – они достигли уровня в 20-21 %. Но это официально. Впрочем, даже согласившись с этими цифрами, нельзя не признать, что инфляционная спираль продолжает непрерывно раскручиваться.



Уже объявлено, что с начала 2013 года ожидается повышение цен на бензин, алкоголь, табачные изделия. На днях существенно выросли тарифы на телефонные звонки в дальнее и ближнее зарубежье. Ну а про коммунальные услуги можно и не говорить, ведь нам постоянно напоминают, что мы погашаем лишь малую часть расходов ЖКХ.

В связи с этим абсолютно логичным выглядит недавнее решение Минского облисполкома. Было объявлено, что для жителей Минщины тариф на вывоз коммунальных отходов увеличивается в 3 раза. Платить за вывоз 1 кубического метра мусора нужно будет 20 700 рублей (раньше — 7440 руб.). Трёхкратный рост объясняется тем, что данные услуги очень затратны. Более 60 % расходов покрывается из областного бюджета. Поэтому мусор и вырос «в цене».

Можно с уверенностью предположить, что схожие процессы по увеличению тарифов ЖКХ в скором времени произойдут и в других регионах страны. Например, сейчас в Климовичском районе УКП «Коммунальник» осуществляет вывоз и обезвреживание твёрдых бытовых отходов по тарифу 8520 рублей за 1 кубический метр. Вряд ли такие деньги покрывают затраты на оказание коммунальных услуг, если это не происходило в более богатой Минской области. Так что климовчанам также следует ожидать повышения. Кстати, некоторые услуги «Коммунальника» уже сегодня при всём желании не назовёшь дешёвыми. Так, желающие убрать крупногабаритные отходы, например, после ремонта, должны знать, что перевозка и размещение отходов в места их захоронения обойдётся им в приличную сумму. Этой осенью 1 час работы трактора стоил 117 900 рублей, 1 час работы погрузчика — 46 600 рублей.

Для полного раскрытия темы добавим, что 1 августа 2012 года Климовичский райисполком принял решение № 15-12 «О нормативах образования коммунальных отходов». Согласно принятому решению на территории Климовичского района установлены дифференцированные нормативы образования коммунальных отходов на расчётную единицу. Фактически это означает, что на каждый жилой дом, общественное или иное учреждение имеются нормативы по образованию отходов. Например, в жилых домах среднегодовая норма составляет 262 кг на одного проживающего. Перечень организаций очень подробный, в нём представлены практически все учреждения района. Скажем, детским садам дан норматив в 77 кг на одно место, школам — 70 кг на учащегося. Гостиница располагает 120 кг на одно место, а учреждения печати, радио и телевидения должны исходить из 100 кг на одного сотрудника.

Так что, как видите, всё уже подсчитано. Осталось дождаться увеличения тарифов.

СНЕГ НА ГОЛОВУ, А СОСУЛЬКИ В ГОЛОВУ

Елена ПОЛЯКОВА

Зима в Беларусь опять пришла неожиданно. Уже заканчивался декабрь, уже ударили ощутимые морозы, но поваливший снег застал врасплох коммунальные службы. Оказывается, сейчас у них не хватает техники и людей, чтобы своевременно убирать образовавшиеся снежные заносы.

Не только в провинции, но даже в Минске не хватает людей для уборки снега. В столице, как сообщают официальные лица, отсутствует примерно треть от необходимого числа работников, которые должны быть заняты в очистке пешеходных зон и тротуаров. При этом чиновники сетуют на то, что «далеко не каждый согласен идти на такую работу за предложенную зарплату». По их словам, уборщик территории получает около 3,5-4 млн. рублей. Как тут не сказать, нам бы ваши проблемы!

Заваленный снегопадами Минск расчищают общими усилиями. Мингорисполком обязал все предприятия убирать снег вместе с коммунальными службами. Похожая ситуация наблюдается по всей стране. Чистят дворы и крыши, детские садики, больницы и школы. Информация о ходе уборки напоминает сводки с фронта. К сожалению, появились первые жертвы этой зимы. 11 декабря в Кировске трагически погибла молодая 30-летняя женщина. Она находилась во времянке, когда под тяжестью снега обрушилась кровля сарая. Упавшая балка пробила лёгкое, причинив смертельную травму. Без матери остались двое несовершеннолетних детей.

Но помимо снега опасность представляют и другие зимние угрозы. Мы говорим о сосульках, свисающих с большинства крыш жилых зданий. Бороться с ними сложнее, чем с последствиями снегопадов. Необходимы специальные средства механизации — автовышки. В больших городах каждый зимний сезон создают бригады по очистке кровель, для работы на высоте нередко привлекают промышленных альпинистов. Образование наледи и сосулек происходит непрерывно, поэтому проводить очистку необходимо всё время.

Чтобы не стать жертвой падающих ледяных «морковок», остерегайтесь ходить под крышами, карнизами, балконами домов. Также запрещайте детям играть на опасных участках, не оставляйте автомобили в таких местах. Несмотря на то, что настоящая зима ещё впереди, большие и малые сосульки уже успели образоваться. Ледяная красота, конечно, красива, но одновременно и опасна.



1200 ВЁРСТ ПА БЕЛАРУСІ

<u>Міхась ЧАРОТ</u>

НЕАБХОДНЫ ЎСТУП АД "КЛІМАВІЦКАЙ ІНФА-ПАНАРАМЫ":

У 20-я гады Міхась Чарот лічыўся самым вядомым паэтам Савецкай Беларусі. Нават літаратурным класікам Коласу і Купале раілі павучыцца ў маладога творцы. Справа ў тым, што творчасць Чарота была цалкам прысвечана новым грамадскім з'явам, бурлівым пераменам у тагачасным жыцці. Ён праслаўляў Савецкую ўладу, у вершах і паэмах падтрымліваў палітыку камуністычнай партыі. Калі ў 1924 годзе адзін з кіраўнікоў БССР Аляксандр Чарвякоў выправіўся ў вандроўку па краіне, Чароту даручылі паехаць разам з ім. У выніку з'явіўся адмысловы нарыс "1200 вёрст па Беларусі", які захаваў цікавасць і для сучасных чытачоў. У ім вельмі добра перадаецца атмасфера таго часу, таму мы вырашылі перадрукаваць урывак аб прыездзе ў Клімавічы. Мінулае трэба ведаць, бо гісторыя паўтараецца для тых, хто забываецца пра яе ўрокі. Наапошак некалькі слоў пра лёс гэтых людзей. Міхась Чарот быў арыштаваны і расстраляны ў 1937 годзе. Аляксандр Чарвякоў, якога таксама збіраліся арыштаваць, застрэліўся ў сваім службовым кабінеце.

"Выехалі з Крычава пад вечар… З шасейнай дарогі нам прыйшлося павярнуць на праселачную, якая вяла ў Клімавічы.

Ужо першая веска гэтага далекага і глухога кутка Беларусі кінулася ў вочы сваей сćарадаўнасцю, як і ў стылі пабудовы хат, так і адзенні сялянства. Вось тут дык сапраўды непадробленая, не сапсутая сучаснай модай беларуская вопратка. Усе кабеты, як старыя, так і маладыя, у самадзельных тканінах, колер якіх здалек кідаецца ў вочы сваею пстратою. А мужчыны — дык тыя і летам ходзяць у старамодных беларускіх шапках-лямцоўках.

Прыехалі ў Клімавічы (зараз Калінінскі павет), калі было 9 гадзін вечара. Клімавічы — гэта быў канечны пункт нашага падарожжа. Раскіданыя нізенькія будынкі горада. Маўклівасць вуліц і наогул цішыня жыцця абвеялі мяне подыхам глухога беларускага лесу…

Палова дня пайшла на агляд і знаемства з мясцовымі ўстановамі: каапераtыў, райсаюз, дзіцячы дом і іншыя. Трэба сказаць, што становішча ў дзіцячых дамах, дзе толькі ні прыходзілася празджаць, робіць дрэннае ўражанне. Усюды недахват бялізны, не зусім добра агледжаны пакоі, дзе дзеці спяць і праводзяць вольны час… Так і ў Клімавічах. Выхавацелі скардзяцца, што няма таго, няма гэтага. Ім позна адпускаюць грошы на пакупку прадуктаў. Сярод дзяцей ёсць хворыя і нават заразнымі хваробамі, але чамусьці ўсе разам спяць, палуднуюць і гуляюць… Няма ізалятара, няма прыёмнага пакоя… Няма, мусіць, месца і ў мясцовай бальніцы. Дзе б можна было лячыць гэтых беспрытульных дзяцей…

У гэты самы дзень нам прыйшлося пабываць у мясцовай бальніцы. Хворых шмат. Хваробы ўсе тыя самыя, аб якіх прыходзілася пісаць раней. Усе палаты заняты выключна сялянамі… Доктар скардзіцца, што няма лякарства, няма чым рабіць перавязкі… Няма грошай, каб можна было што набыць…

Вечарам у садзе адбыўся мітынг. Сабралася тысячная грамада. Адчыніў мітынг старшыня павятовага выканаўчага камітэта тав. Кандраль… Выступіў вітаць усебеларускага старасту маленькі хлопчык-піянер. Ен, на здзіў усёй грамадзе, вітаў Чарвякова на прыгожай беларускай мове.

— Заўсёды гатовы! — закончыў ён сваім піянерскім лозунгам пад гарачыя воплескі грамады.

Пасля пачалі вітаць ад рабочых арганізацый. Прывітанні гаварылі на ўсіх мясцовых мовах: беларускай, яўрэйскай, польскай і рускай. Калі адным з прамоўцаў было абмалевана цяжкае становішча сялян і рабочых у Заходняй Беларусі, пачаліся прамовы з пратэстам і абурэннем супраць панскіх здзекаў і гвалтаў над непавіннымі працоўнымі беларускімі сялянамі. Выйшла так, што на мітынгу, які сабраўся вітаць прыехаўшага ўсебеларускага старасту, вынесена была рэзалюцыя пратэсту супраць гвалтоўнай палітыкі панскай Польшчы. Пачалі разыходзіцца пасля дванаццатай гадзіны ночы…".

«БЕЛО-КРАСНО-БЕЛЫЙ, КОНЕЧНО, БОЛЕЕ СИМПАТИЧЕН»

<u>Игорь ПОТАПЧУК, Прессбол</u>

Лучшая белорусская спортсменка 2012 года Александра Герасименя считает, что Европа нашей стране ментально ближе, чем Россия.



26-летняя пловчиха собрала в уходящем году рекордный урожай наград. Она успешно выступила на Олимпиаде в Лондоне, завоевав две серебряных медали. Потом было первенство Европы, где Герасименя «выплавила» полный комплект наград: золото, серебро и бронзу. И еще одно золото она добыла на чемпионате мира.

«Прессбол» признал Александру Герасименю вместе с теннисисткой Викторией Азаренко лучшими спортсменками 2012 года. Во время онлайн-конференции на сайте этого издания у «золотой рыбки» спросили:

— Какой геополитический вектор Беларуси вам ближе — Россия или Запад?

— Европа, конечно. Мы оттуда ментально, — считает Герасименя. — Россия пусть тянется за нами, ей не повредят общепринятые ценности цивилизованного мира.

Также у спортсменки поинтересовались, какой флаг ей ближе: красно-зеленый или бело-красно-белый?

— С точки зрения эстетики бело-красно-белый, конечно, более симпатичен, — ответила Герасименя. — Да и история у него куда богаче и насыщенней — Великое княжество Литовское, Новогрудок, Мир, Несвиж, тот же Клецк. Мне не хочется думать о том, что Беларусь ведёт отсчёт от 1917 года и гордится тем, что мы чемпионы мира по количеству улиц Ленина, Маркса, Энгельса и еще бог знает кого, кто у нас отродясь не бывал. В нашей истории есть немало славных дат, и давайте не будем забывать, что в своё время ВКЛ было одним из влиятельнейших государств Европы.



ЯК ПАРТЫЗАНЫ ЗАБІЛІ СЯСТРУ МАКСІМА ТАНКА

Сяргей МАКАРЭВІЧ, Наша Ніва

Фарба на агароджы гэтай магілы на Касцяневіцкіх могілках амаль злупілася. Вакол агароджы высечана кустоўе. Але ўнутры — не. Даводзіцца пачысціць самому. Касцяневіцкія людзі глядзяць свае клады, але на самой магіле павінны чысціць сваякі. А няма каму.



“Скурко Вера, жыла 24 гады. І сын Яраслаў, жыў 2 гады. Памерлі ў 1943 г.” Ні слова больш. Так сёння выглядае магіла роднай сястры паэта Максіма Танка (Яўгена Скурко). Адшукаць яе ўдалося толькі з другога разу.

Фортка агароджы намёртва закручаная ржавым балтом. Помнік парастае мохам. На магіле — штучныя кветкі.

"...Веры абгародку паставілі ў Касцяневічах, памагаў шафёр, я яму за гэта заплаціў", — пісаў брат Фёдар да Танка 22 чэрвеня 1973.

Вера — маладзейшая за Максіма Танка. Мяркуючы па надпісе на помніку, яна нарадзілася ў 1918 ці 1919. У студзені 1938-га выйшла замуж за Браніслава Лётку, на хутар побач з вёскай Сэрвач (Вялікая Сэрвач) недалёка ад Касцяневічаў. Той хутар купіў Браніслава бацька з грошай, зробленых у Амерыцы.

Захаваўся вясельны здымак. На ім — Вера ў шлюбнай белай сукенцы, побач малады — бы асілак.

Існуюць дзве версіі смерці жанчыны і яе малога сына.

ВЕРСІЯ АФІЦЫЙНАЯ

Яўген Іванавіч у сваіх дзённіках 12 студзеня 1973 запісаў: "Пісьмо ад Федзі. Піша, што памёр наш швагер Браніслаў Лётка. Страшную трагедыю перажыў ён і ўся наша сям’я. У час вайны нейкі гмінны службіст загадаў Браніславу адвезці яго ў Куранец, а па дарозе іх абстралялі партызаны, здаецца, з атрада "Народны мсціўца" і захапілі ў палон гэтага службіста. "Хто цябе падвозіў?" — "З Сэрвачы Лётка". Тут жа расправіліся з ім і з сем’ямі братоў Лёткаў: забілі сястру Веру і яе двухгадовага сына, забілі швагерку з дзесяцігадовым сынам. А мужыкі іх — ацалелі. Былі ў суседняй вёсцы. Калі вярнуліся — засталі адны папялішчы. Потым браты былі мабілізаваны, прайшлі з баямі праз усю Польшчу, штурмавалі Берлін..."

Танк піша, што ў той справе "быў замешаны нявераўскі "Папок", які, будучы партызанам, займаўся рабункам. Пасля вайны нейкі час працаваў брыгадзірам у калгасе. Але за тое, што біў людзей, яго судзілі. Сястра яго доўга распрадавала нарабаванае ім дабро..."

СТРАШНАЯ ПРАЎДА

Праўда жыцця была яшчэ страшнейшай за гэтую падрэтушаваную, літаратурную. Яе перадавалі з вуснаў у вусны землякі Танка.

Неяк увечары мужчынская палова Лётак пайшла на суседні хутар гуляць у карты. Была ўжо ноч, калі прыйшлі на Лёткаў хутар партызаны. Шукалі яны золата, якое нібыта далі Веры ў пасаг бацькі. (Яны былі заможныя, калі прыйшлі саветы ў 1939-м. Стаяла нават пытанне пра іх раскулачванне.)

Мучылі партызаны жанчын, але золата не знайшлі. Ці то яго і не было, ці то не аддалі гаспадыні. Не думалі жанчыны, што бандыты не захочуць пакідаць сведкаў.

Забілі ж Веру з дзіцем і астатніх сякерамі — каб без шуму, без стрэлаў...

Мужчыны з суседняга хутара бачылі агні ліхтароў на сваім дварышчы, але не пабеглі туды. Падумаць не маглі, што там робіцца...

Праз некалькі дзён на хутар бацькоў Веры ў Пількаўшчыне заязджалі партызаны. Адзін з коней быў як папонай укрыты пасажнай хатняй посцілкай. У кожнай гаспадыні яны былі на свой узор, вось маці і пазнала даччыну. Домна Іванаўна кінулася пытацца: адкуль жа ў вас посцілка маёй дачушачкі...

На той момант маці яшчэ не сказалі пра смерць дачкі. А бацька Іван Хведаравіч усё ўжо ведаў. Янук жонку за руку схапіў і не пусціў да вакаў: не наша гэта посцілка, ты блытаеш...

Пазней да бацькоў прыязджаў партызанскі камандзір, а пасля вызвалення Беларусі — намеснік старшыні Вілейскага аблвыканкама Фёдар Маркаў.

Ён вініўся і быў гатовы расстраляць забойцаў Веры і яе сям’і проста на вачах бацькоў — варта было толькі назваць імёны. Але стары не захацеў новай крыві, сказаў: "Хай Бог разбіраецца". Хоць імёны забойцаў не былі сакрэтам у наваколлі.

Пра смерць сястры Максіму Танку ў маі 1944-га расказаў той самы Маркаў.

Вось так было. Нацысты не зачапілі сям’і камуністычнага паэта, кроў пралілі затое лясныя бандыты, па-іншаму іх не назавеш.

СЛЕД ПРАПАЎ

Магіл з прозвішчам Лётка на Касцяневіцкіх могілках няма. З гэтага роду ніхто тут не застаўся, а старыя камяні паўязджалі ў зямлю.

Як склаўся лёс Браніслава Лёткі пасля штурму Берліна? Пасля Другой сусветнай Браніслаў знайшоў спосаб застацца ў Польшчы. Максім Танк, расказваюць сваякі, нават бачыўся з ім падчас замежнай камандзіроўкі. Але пра гэта ў запісах самога Яўгена Іванавіча ні слова.

"Гэта лішняе", — так казалі старыя пісьменнікі.



ВОДИТЕЛЬ АВТОБУСА ВЕРНУЛ ЗАБЫВЧИВОЙ ПАССАЖИРКЕ 390 ТЫСЯЧ ЕВРО

В Вене водитель автобуса вернул деньги, которые на сиденье забыла пожилая пенсионерка, сообщает Agence France-Presse со ссылкой на местную полицию и прессу. Всего в пакете, обнаруженном водителем, находилось 390 тысяч евро.

Проверяя после рейса салон автобуса, 51-летний водитель, фигурирующий в заметке как Вольфганг Р., наткнулся на пакет. «Сначала я подумал, что это чьи-то покупки или лекарства», – признался водитель. Распаковав пакет, он обнаружил в нем деньги и обратился к начальству. Вскоре хозяйка денег нашлась, и ей были возвращены её сбережения. В транспортной компании отметили, что гордятся своим сотрудником, проявившим честность.

Недавно похожий случай произошел в Сингапуре. Там водитель такси, обнаруживший в машине пакет с деньгами (в сумке было более миллиона сингапурских долларов, то есть около 900 тысяч долларов США), вернул их забывчивым пассажирам.

ІНТЭРНЭТ-БІБЛІЯТЭКА KAMUNIKAT.ORG: БОЛЬШ ЗА 10000 БЕЛАРУСКІХ ВЫДАННЯЎ



Праект “Беларуская інтэрнэт-бібліятэка Kamunikat.org”, які рэалізуе Беларускае гістарычнае таварыства, на працягу некалькіх гадоў мае фінансавую падтрымку Міністэрства замежных спраў Польшчы ў рамках праграмы “Польская дапамога".

Партал існуе з 2000 году і арыентаваны на збор незалежных беларускіх выданняў. На сайце www.kamunikat.org можна знайсці кнігі, газеты, аўдыё і відэа. Усяго размешчана больш за 10000 розных беларускіх выданняў. А ў раздзеле “Перыёдыка” знаходзяцца ўсе нумары “Клімавіцкай Інфа-Панарамы” за 2012 год.

НУ И БИЛЕТИК...

- Ваш билетик?
- Мой билетик.
- Ваш билетик?
- Мой билетик.
- Вы что больной?
- А вы что доктор?
- Ваш билетик!
- Мой билетик...
- Вы другие слова знаете?
- Знаю: пылесос.
- Я контролёр!
- А я сантехник...
- У вас все дома???
- А вы хотите в гости?
- Ваш билетик!!
- Мой билетик...
- Вы что — заяц?
- А вы что — волк?
- Ваш билетик!!!
- А зачем он вам?
- Ну, я посмотрю...
- Ну, купи себе и смотри...
- Ваш билетик!!!
- А вот и моя остановочка!!!

АСЦЯРОЖНА З ГРЭЙПФРУТАВЫМ СОКАМ!

Сок з грэйпфруту можа аказацца для вас смяротна небяспечным, калі вы прымаеце некаторыя лякарствы.


Інфармацыя аб гэтым з’явілася на сайце Радыё Свабода — www.svaboda.org. Паведамляецца, што грэйпфруты — а таксама некаторыя іншыя цытрусавыя, як лайм і памэла — утрымліваюць рэчывы, якія ў некалькі разоў павялічваюць сілу дзеяння лекаў, што можа выклікаць вострую нырачную недастатковасць, праблемы з дыханнем, унутраны крывацёк і нават раптоўную смерць.

Канадскі доктар Дэвід Бэйлі, якія даследуе ўзаемадзеянне цытрусавых з медыкаментамі, нядаўна апублікаваў спіс лекаў, якія ўваходзяць у непажаданыя і небяспечныя для здароўя рэакцыі з грэйпфрутавым сокам: «З грэйпфрутам не спалучаюцца многія з лекаў, якія часта прапісваюць лекары, прычым у самых звычайных выпадках накшталт сардэчна-сасудзістай недастатковасці. Верагоднасць узнікнення непрыемных наступстваў павялічваецца, паколькі за апошнія чатыры гады колькасць несумяшчальных з грэйпфрутам медыкаментаў узрасла» — папярэджвае Дэвід Бейлі.

Паводле доктара Бэйлі і іншых канадскіх даследнікаў, існуюць 85 лекавых сродкаў, якія не сумяшчаюцца з некаторымі цытрусавымі.

ФРАЗЫ, ЗА ЯКІЯ 25 ГАДОЎ ТАМУ МОЖНА БЫЛО Б ТРАПІЦЬ У ДУРДОМ

Блін, не магу ўвайсці ў пошту.
Я тэлефон дома забыўся.
Я зарабляю тры мільёны.
Давай падорым яму хатні кінатэатр.
Дай мне дзве тысячы рублёў на метро.
А для паездкі ў Крым віза трэба?
У мяне ўжо рука замёрзла з табой размаўляць.
Скінь мне фота на мыла.
Я качаю эльфа.
Ды ты на тэлефоне палічы.
Перайманyй папку.
Пакуль машына ехала, паспела кнігу паслухаць.
Памяняй мне расійскія рублі на беларускія.



КЛІМАВІЦКАЯ ІНФА-ПАНАРАМА

Клімавіцкі грамадска-палітычны бюлетэнь
Адказны за выпуск: Аржанцаў Сяргей Юр’евіч
Адрас: Клімавічы, вул. Леніна, д. 27а, кв.15.
Надрукавана на ўласным абсталяванні. Наклад 299 асобнікаў
Распаўсюджваецца бясплатна